Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

А. КРЫНІЦКІ

# ЧАРГОВЫЯ ПЫТАНЬНІ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПАЛІТЫКІ КП(б)Б

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВЫДАНЬНЕ ЦК КП(б)Б
МЕНСК—1926

А. КРЫНІЦКІ

# ЧАРГОВЫЯ ПЫТАНЬНІ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПАЛІТЫКІ КП(б)Б

(Даклад на сходзе актыву Менскай гарадзкой арганізацыі КПБ 25-га верасьня 1926 г.)

ВЫДАНЬНЕ ЦК КП(б)Б
МЕНСК—1926

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь
Урадавая бібліятэка імя Горкага
Інв. № 348970
НФ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1-ая Дзярж. друк. Заказ № 323. У ліку 15.000 экз. Галоўлітбел № 21.953.

## Аб чарговых пытаньнях нацыянальнай палітыкі КПБ

Таварышы, дакуманты па данным пытаньні—аб нацыянальнай палітыцы КПБ былі агалошаны ў апошні час у газэтах, аб іх вы ўсе ведаеце. Пастанова аб беларусізацыі савецкага і каапэрацыйнага апарату, зьняцьце з працы некалькіх супрацоўнікаў Наркамзему, пастанова аб нацыянальным складзе кіруючых працаўнікоў КПБ (гэтак званая «карэнізацыя»), намечаны пераход на беларускую мову «Звезды» з 1-га студзеня, высунутая ў палітлісьце ЦК задача кіраўніцтва ўсім культурным будаўніцтвам,—вось асноўныя факты, якія ў некаторых частках нашае арганізацыі, у некаторых ячэйках і ў сузнаньні некаторых таварышоў пакінулі шэраг пытаньняў, шэраг сумненьняў. Я сёньня лічу зусім непатрэбным спыняцца на шмат якіх важных, але даўно выказаных прынцыповых момантах нацыянальнае палітыкі ў УсеКП і, у асобку, КПБ. Мне здаецца, сёньня трэба адказаць толькі на тыя пытаньні, якія ўзьніклі, галоўным чынам, у зьвязку з тым, што цяжкасьці праведзеньня нацыянальнае палітыкі на справе, калі мы ўсімі сіламі змагаемся за гэту справу, аказваюцца большымі, чымся шмат каму з нас гэта здавалася раней. Абавязкова трэка, каб у КПБ зусім ясна разумелі ўсе гэтыя цяжкасьці, асаблівасьці, тонкасьці паасобных момантаў нашае працы па нацыянальнай палітыцы; і ад Менскай арганізацыі, як аднэй з асноўных арганізацый у КПБ, гэта патрабуецца ў першы чарод.

Шэраг пытаньняў, што ёсьць зараз у нашай партыйнай арганізацыі ў зьвязку са ўсімі нашымі апошнімі пастановамі можна згрупаваць у тры асноўныя. **Першае**—ці не зьяўляецца ўся нацыянальная палітыка КПБ, у паасобку, беларусізацыя, адступленьнем перад дробна-буржуазнай інтэлігэнцыяй БССР; значыцца, ці ня стаў ЦК КПБ на шлях аслабленьня кіраўніцтва пралетарыяту ў БССР? **Другое** пытаньне—ці не прывядзе лінія ЦК КПБ у нацыянальнай палітыцы да ўзмацненьня розьні між рабочымі і працоўнымі розных нацыянальнасьцяў БССР? **Трэцяе** пытаньне—ці не супярэчыць правадзімая лінія па нацыянальнай палітыцы, у асобку, лінія адноснага нацыянальнага складу кіруючых кадраў КПБ, гэтак званая карэнізацыя, задачы бальшавізацыі КПБ?

### Нацпалітыка і кіраўніцтва пралетарыяту.

Першае пытаньне, на якое я хачу адказаць,—наконт забясьпечаньня кіраўніцтва пралетарыяту. Трэба крыху прыпамятаць аб задачах і сутнасьці нацыянальнае палітыкі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Апошні раз партыя шырока абгаварвала гэта пытаньне на XII зьезьдзе. **Сталін** тады зазначаў: «Тут (г. ё., у нацыянальным пытаньні) мы маем справу з пытаньнем аб устанаўленьні правільных узаемаадносін між пралетарыятам былой дзяржаўнай нацыі, які зьяўляецца найбольш культурным пластом пралетарыяту ўсяе нашае фэдэрацыі, і сялянствам, пераважна сялянствам тых нацыянальнасьцяў, якія раней былі прыгнечаны. У гэтым клясавая сутнасьць нацыянальнага пытаньня». І далей гэты клясавы момант **Сталін** падкрэсьліў у сваім заключным слове на XII зьезьдзе. Ён казаў: «Трэба памятаць, што, апрача права народаў на самавызначэньне, ёсьць яшчэ права рабочае клясы на замацаваньне сваёй улады і гэтаму апошняму праву падначалена права на самавызначэньне. Бываюць выпадкі, калі права на самавызначэньне пачынае пярэчыць другому, **вышэйшаму праву—рабочае клясы, якая прышла** да ўлады, на замацаваньне сваёй улады*). У такіх выпадках—гэта трэба сказаць проста—права на самавызначэньне ня можа і не павінна служыць перашкодай справе ажыцьцяўленьня права рабочае клясы на сваю дыктатуру. Першае павінна адступіць перад другім». Спачатку заўвага: Сталін гаворыць не аб усім аб'ёме нацыянальнага пытаньня, а аб яго самым важным моманце—праве на самавызначэньне; аднак, тое, што датычыць гэтага моманту,—датычыць уцалку і нацыянальнага пытаньня.

Гэты клясавы момант—момант забясьпечаньня перамогі і кіраўніцтва рабочае клясы—зьяўляецца пераважным ва ўсёй лініі партыі па нацыянальным пытаньні, у пастановах XII зьезду ў асобку. Вядома, калі казаць аб БССР, дык гутарка ня ідзе аб тым, што пытаньні нацыянальнае палітыкі павінны зусім адступіць перад агульным пытаньнем—аб забясьпечаньні кіраўніцтва рабочае клясы ў БССР; справа ў тым, што галоўным момантам, які характарызуе ўсю палітыку партыі і сав. улады, зьяўляецца момант замацаваньня дыктатуры пралетарыяту.

Сталін далей дае вытрымку слоў Леніна аб Марксе: «Разглядаючы ліст Маркса па нацыянальным пытаньні ў артыкуле аб самавызначэньні, Ленін робіць гэткі вывад: «у параўнаньні з рабочым пытаньнем, **падначаленае значэньне нацыянальнага пытаньня** не падлягае сумненьню для Маркса». (Зразумела, калі Маркс гаворыць аб рабочым пытаньні, ён разумее не рабочае пытаньне ў вузкім сэнсе гэтага слова—заработная плата, ахова працы і г. д.,—а агульнае пытаньне аб гістарычнай ролі рабочае клясы).

Варта таксама прыпомніць, што казаў Ленін у сваіх указаньнях камуністам Украіны: «...Няўхільна імкнучыся да адзінства нацый, бязьлітасна перасьледуючы ўсё, што можа

*) Усюды падкрэсьлена прамоўцам. А. К.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

разьяднаць іх, мы павінны быць вельмі **асьцярожнымі, цярплівымі, уступчывымі да перажыткаў нацыянальнага недавер'я. Няўступчывымі, незамірымымі мы павінны быць да ўсяго таго, што датычыць асноўных інтарэсаў працы ў барацьбе за яе вызваленьне ад няволі капіталу».**

Вы ведаеце, што і ва ўсякай працы КПБ мы дамагаліся, дамагаемся і ідзём да таго, каб ажыцьцявіць гэту лінію партыі, выказаную ў вучэньні ленінізму, у прыведзеных словах Леніна і Сталіна, у пастановах зьездаў партыі, каб пры правядзеньні нашае нацыянальнае палітыкі разглядаць яе толькі, як шлях, а не як непасрэдную мэту, шлях да вырашэньня вялікіх агульных сацыяльна-палітычных задач рашаючых, усё абымаючых. Асноўны кірунак нашае нацыянальнае палітыкі вядзе на выкананьне пяцёх асноўных момантаў. (І калі мы губляем гэту асноўную пэрспэктыву,—мы пачынаем рабіць памылкі). Першае—забясьпечаньне і замацаваньне кіраўніцтва пралетарыяту ў сацыялістычным будаўніцтве БССР і замацаваньне сувязі Савецкага Саюзу і Беларускае ССР, як непадзельнае часткі Саюзу; другое—замацаваньне лучнасьці пралетарыяту з сялянствам, узмацненьне кіруючае ролі пралетарыяту, паглыбленьне даверʼя да пралетарыяту і яго партыі з боку сялянства і мястэчковага працоўнага жыхарства, з боку працоўных усіх нацыянальнасьцяў; трэцяе—агульны культурны рост краю, роўналежны з нарастаньнем сацыялістычных элемэнтаў у экономіцы; чацьвертае—уцягненьне ўсяе інтэлігэнцыі БССР у сацыялістычнае будаўніцтва; пятае—бальшавізацыя КПБ, асноўнае зброі рабочае клясы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Вось пэрспэктывы нашае працы—гэтыя пяць асноўных задач. І пры правядзеньні нацыянальнае палітыкі ў накіраваньні гэтых задач мы сустракаемся з вялікімі цяжкасьцямі, аб якіх мы гаварылі не адзін раз. З чаго яны складаюцца? Паперш за ўсё з таго, што пралетарыят БССР надзвычайна моцна русіфікаваны ў аднэй палове; у другой—у яго шэрагах ёсьць значная частка яўрэйскіх рабочых, адарваных ад беларускае вёскі значна больш, чым русіфікаваная частка рабочых. Яўрэйская частка рабочых БССР многімі ніткамі зьвязана з самтужнікамі гораду і мястэчка, у той час, як у Саюзе рабочая кляса ў большай частцы вышла з вёскі і цесна зьвязана з сялянствам.

Усё гэта відаць з данных аб нацыянальным складзе прафсаюзаў. Калі ў прафсаюзах у цэлым налічваецца 55,6% беларусаў, 27,6% яўрэяў, 9,6% расейцаў і каля 4% палякаў, то ў прамысловых саюзах, г. зн. у саюзах, якія выказваюць моцнасьць пралетарскае прамысловае базы ў нашай Рэспубліцы, мы бачым адносна двух асноўных нацыянальнасьцяй—беларускай і яўрэйскай—наступнае: у саюзе дрэваапрацоўнікаў—мы маем яўрэйскіх і беларускіх рабочых пароўну, у скурані-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

каў—на 1.000 і больш беларусаў прыпадае 4.000 яўрэйскіх рабочых (усюды лічбы акруглены); у мэталістаў—пароўну; у друкароў—на 340 белар.—1300 яўрэяў; у харчавікаў—пароўну; у будаўнікоў на 3.600 беларускіх рабочых звыш 5.000 яўрэйскіх рабочых; у тэкстыльшчыкаў пароўну. У чыгуначнікаў—у важнейшым пралетарскім атрадзе—вельмі вялікім па ліку, большым, чым усе рабочыя ВСНГ,—на 17.000 рабочых маем каля 14.000 беларусаў, 1.700 расейцаў і 237 яўрэяў. (У апошнім выпадку мы бачым малюнак, які тлумачыцца ўсёй палітыкай царскага ўраду ў падборы рабочых і служачых на чыгунках).

Я ня буду прыводзіць данных адносна іншых саюзаў. Што ясна? Ясна, што ў прафсаюзах у цэлым мы маем перабольшваньне беларусоў і вялікі процант яўрэяў. У прамысловых-жа саюзах [1]) (бяз чыгуначнікаў) мы маем невялікае перабольшваньне яўрэяў: на 15.000 беларусоў каля 18.500 яўрэяў. Лічачы з чыгуначнікамі, мы маем значнае перабольшваньне беларусоў: 28.000 беларусоў і 18.600 яўрэяў. Да таго-ж трэба адзначыць, што рабочыя беларусы далёка ня ўсе ўладаюць беларускай мовай, паколькі горад у царскія часы іх моцна русіфікаваў.

Русіфікацыя ў мінулым беларусоў-рабочых, вялікі процант яўрэяў перашкаджаюць рабочай клясе падыйсьці да вёскі на яе роднай беларускай мове.

Апроч таго, кіраўніцтву рабочай клясы гораду перашкаджае і тое, што горад у цэлым і значна русіфікаваны, і на 40-50% зьяўляецца яўрэйскім, г. зн. ня ведае мовы вёскі. Таксама ў горадзе мы маем налічча значных рэштак русіфікаванае інтэлігэнцыі ва ўсіх нашых апаратах. Нагіядаюцца таксама выяўленьні нацыяналізму і шавінізму ў шэрагах інтэлігэнцыі ня толькі расейскай, але і беларускай, і яўрэйскай, і польскай. Усё гэта зьяўляецца цяжкасьцямі, якія перашкаджаюць ажыцьцяўляць задачу кіраўніцтва пралетарыяту ў адносінах вёскі.

Усе гэтыя цяжкасьці мы можам перамагчы і пераможам **толькі тады, калі шляхам настойлівай і сыстэматычнай працы правядзём беларусізацыю (рознымі мэтадамі ў адносінах да розных груп насельніцтва).**

Кажучы аб нацыянальным пытаньні, трэба адзначыць асабліваe становішча і значэньне ў нашым будаўніцтве беларускае інтэлігэнцыі. Гэта значэньне інтэлігэнцыі дае прычыну некаторым таварышам лічыць, што калі мы праводзім нацыянальную палітыку, у прыватнасьці беларусізацыю, то гэта ёсьць уступка інтэлігэнцыі. Зразумела, гэта ня так. Бухарын казаў на XII зьезьдзе: у спрэчках па дакладу аб нацыя-

---

[1]) Да іх аднесены: папяров., дрэваапрац., скурзвікі, мэталісты, друкары, харчавікі, будаўнікі, тэкстыльшчыкі, хімікі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

нальнай палітыцы... кажуць: «усё гэта выдумкі інтэлігэнцыі; сялянству няма ніякае справы да нацыянальнага пытаньня; трэба вырашыць **зямельнае пытаньне** і г. д., і ад вырашэньня гэтых пытаньняў залежыць вырашэньне нацыянальнага пытаньня». «Гэтыя аргумэнты,—кажа Бухарын,—мы чулі даўным даўно; гэтым аргумэнтам апэрыравалі ўсюды: і на Украіне, і ў Грузіі і можа нават на Марсе гэты аргумэнт ужываецца». Гэта гаварылася на XII зьезьдзе партыі, аб гэтым і ў КПБ таксама прыходзілася гаварыць не адзін раз. Ясна, што наша нацыянальная палітыка зусім **не падлягае запатрабаваньням інтэлігэнцыі,** а ў часьці беларусізацыі—беларускай інтэлігэнцыі. Але значэньне ў культурным будаўніцтве, асабліва беларускай інтэлігэнцыі, стварае некаторую фікцыю, няправільнае разуменьне рэчаў. Сапраўды, наша беларуская інтэлігэнцыя значна зьвязана з сялянствам, бо яна ў большасьці вышла з сялян; яна ведае вёску. Яе значэньне для ўсяго культурнага будаўніцтва відавочнае. Відавочна **патрэбнасьць усё большага ўцягненьня яе ва ўсё будаўніцтва.** Гэту лінію мы вялі і вядзём. У выніку нашае лініі мы бачым, як у яе шэрагах усё больш мацнее наша крыло, блізкае да пралетарыяту крыло—гэта пласт тых людзей, якія на справе працуюць пад кіраўніцтвам рабочае класы і яе партыі. Праз гэта крыло мы ўзмацняем увагу і на хісткі, што яшчэ ня вызначыўся, пласт інтэлігэнцыі.

Нашу ўвагу да інтэлігэнцыі, уцягненьне ў сацыялістычнае будаўніцтва шырокіх пластоў яе некаторыя таварышы прымаюць памылкова, як здачу інтэлігэнцыі кіраўніцтва будаўніцтвам.

Праўда, мы бачым, як дробна-буржуазнае нацыянал-дэмакратычнае—самае правае—крыло інтэлігэнцыі, дае сябе ведаць. Яно жыве перш за ўсё ростам кулацтва ў умовах НЭП'у.

Мы наглядаем у гэтым правым крыле інтэлігэнцыі, сапраўды, надзвычайна рэзка выяўлены ваяўнічы наступаючы нацыяналізм, ненавісьць да пралетарыяту, ненавісьць да камуністычнае партыі і яе кіраўніцтва, рознымі спосабамі замаскаваную, часам падфарбаваную лёгкай фарбай згоды з нашай нацыянальнай палітыкай. Я прачытаю адзін дакумант, вельмі яскравы, здавалася-б нязначны, але выразна характарызуючы настроі гэтага крыла—запіску, паданую ў прэзыдыум урачыстага пасяджэньня, прысьвечанага 20-м угодкам

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы